А. БЯРОЗА.

# „РАСЕЙСКА-ПОЛЬСКІ БАЛЬ
# і
# БЕЛАРУССКАЕ ПАХМЕЛЬЛЕ“

## (Куды ідзець беларускі шлях).

ПІНСК.

Друкарня „Hasło“ 1921.

Z pozwoleniem wojskowej cenzury.

У даўно мінулыя часы жорсткіх войнаў, калі адно з дзікіх плямёнаў перамагала другое слабейшае племя, тагды пераможцы тут-жа на пляцу бітвы так сьвяткавалі сваю перамогу: ўсім палонным скручывалі вяроўкамі рукі і ногі, пасьля раскладалі на зямлі і клалі на іх дошкі, пакрывалі тыя дошкі каберцамі, а затым садзіліся самі, пяялі песьні, пілі хмельны напітак і напіўшыся пьянымі, танцавалі на гэтых дошках. Стогны і крыкі бяздольных палонных, лежачых пад дошкамі, яшчэ больш весялілі падгуляўшых пераможцаў і заглушаліся музыкай, сьмехам і пьянымі крыкамі...

Гісторыя апавядае нам, як ў пазьнейшыя гады, досьць блізкія да нас, ужо не маленькія плямёны, але цэлыя народы, якія дарэчы сказаць, лічылі сябе „культурнымі“, калі перамагалі ў вайне слабейшых за сябе,—так сама сьвяткавалі сваю перамогу, амаль што не падобна да дзікіх плямён. Толькі працяг сьвяткаваньня трываў ня дзень і ня два, а два-тры сталецьця і спосабы морду і зьдзеку над пераможанымі былі хітрэйшыя і больш прадуманыя. І зьдзекаваліся не над некалькімі дзесяткамі палонных, а над цэлым мільёнрым народам.

Быў час, калі расейскі царскі урад, з дапамогай немцаў і аўстрыякаў паняволіў слабейшы польскі народ. У працягу 20 гадоў Польшчу дзялілі тры разы і ў апошні раз, каб зусім аслабіць польскую нацыю і

адняць ў яе надзею на магчымасьць ськінуць сваіх панявольнікаў,—падзялілі Польшчу на тры часткі. Адна частка адышла да Расеі, другая да Нямеччыны, трэцьцяя да Аўстрыі. І кожны з пераможцаў пачаў на яго частцы Польшчы сьвяткаваць перамогу.

Але не маглі яны, як тыя дзікія барбары, сабраць у адну кучу ўвесь паняволены народ, зьвязаць яго і палажыўшы на яго дошкі, сесьці на тых дошках, піць і танцаваць. Не маглі таму, што ня было-ж магчымасьці (а надта хацелась, і каб здалелі—вельмі радасна было-б іх сэрцу)—зьвязяць некалькі мільёнаў людзей і пакласьці іх пад дошкі. Дык яны, ўжо як „культурныя" пераможцы, прыдумалі іншыя спосабы дзеля свайго ганебнага сьвяткаваньнян ад пераможанымі.

Замест дошак налажылі яны на пераможаны народ і яго зямлю свае дзяржаўныя установы, сваю чужацкую культуру, мову і рэлігію. Тыя „культурныя" дошкі аказаліся такія таўстыя і цяжкія, што, седзючы на іх і сьвяткуючы, пераможцы нават ня чулі стогнаў і крыкаў прыціснутага народу. Асабліва і расейскі царызм палажыўшы гэткія „культурныя" дошкі на польскі народ, зўсім засьвяткаваўся і нават забыўся, што ён сядзіць на жывым народным целе. Яму часамі здавалася, што лежучы пад дошкамі польскі народ зусім прыдушаны і можа ўжо сканаў. Але скора заварухнуліся „дошкі" і паляцелі баляваўшыя на іх расейцы: сярод польскага народу пачаліся паўстаньня пад сьцягам вызваленьня Польшчы ад расейскага ярма.

Тут трэба адзначыць, што расейскі ўрад прыціскаючы палякоў, так сама душыў і беларускі народ, бо

з даўных часаў расейцы лічылі Беларусь ня рускай зямлёй, а так званай „Расейскай акраінай“, дзе жывуць якіясь беларусы, размаўляючыя на сваей асобнай мове і якія ня вельмі прыхільна адносяцца да Расеі. Дзеля гэтага расейскі урад лічыў патрэбным таксама і беларусоў перарабляць на маскоўскі капыл.

Прыгнечаны польскі народ тры разы ў працягу 30 гадоў падымаў паўстаньне ўсё жарсцьей душыў і накідаў на польскі народ ўсё новыя ланцугі. Шмат польскіх грамадзян было забіта, павешана і яшчэ больш выслана ў Сібір на катаргу.

Тут зноў трэба успомніць, што караючы палякаў за паўстаньне расейскі урад пачаў душыць і беларусаў і ўсё беларускае, нават горш, чым палякаў. Таксама шмат беларускіх грамадзян было выслана разам з палякамі на катаргу.

Спыніўшы і ўмацаваўшы сваю ўладу на польскай зямлі, расейскі ўрад пачаў сыстэматычную „русыфікацыю“ паняволенага краю. Гэта „русыфікацыя“ пашыраляся таксама і на беларускі народ. З мэтай гэтай „русыфікацыі“ панасылалі ў Польшчу і Беларусь чыноўнікаў, узятых з цэнтральных расейскіх губэрніяў, умацавалі істнаваўшыя расейскія дзяржаўныя установы. Тыя чыноўнікі зусім не разумелі мяйсцовай—ні польскай, ні беларускай—мовы і ва ўсіх установах пісалі і гутарылі толькі на расейскай мове і нават забаранялася зварачывацца да чыноўнікаў на польскай ці на беларускай мове.

Ва ўсіх школах вучням срога забаранялася гута-

рыць на роднай польскай ці беларускай мове і чытаць на гэтых мовах кніжкі.

З прычыны таго, што ні ў воднай установе не ўжывалася ні беларуская ні польская мова і ўсе чыноўнікі не разумелі мяйсцовай мовы, — для народу, а асабліва для селян насталі вельмі цяжкія варункі жыцьця: куды ні кінься з якой небудзь справай, ўсюды цябе не разумеюць і нават ня хочуць знаць у чым твая справа, калі ты ня ўмееш гутарыць па расейску...

Многа гадоў так зьдзекаваўся расейскі ўрад і сьвяткаваў сваю перамогу над слабейшым польскім народам. І апьянеўшы ад безупыннага зьдзеку ён разам ужо глуміўся і высьмеваў чужы і не зразумелы яму беларускі народ. Ня гледзячы на мукі гэтых двух народаў — палякаў і беларусаў, — ня чуючы іх стогнаў і крыкаў ад моцных расейскіх клешчаў, расейскія патрыоты галасілі на ўвесь сьвет: „Німа ніякай Польшчы! Німа ніякай Беларусі! А ёсьць ядыная і недзялімая матушка Русь!“

У пьяным гомане і самаздаволенай радасьці расейскія патрыоты не заўважылі, як падышоў крывавы 1914 год...

Пачынаецца вайна з немцамі. У працягу трох гадоў гэтай страшэннай вайны амаль што ня ўвесь час лінія фронту і самыя жорсткія бітвы, якія спустошылі цэлыя мяйсцовасьці, былі на землях палякоў і беларусоў. Уцякаючы ад вайны мільёны беларускіх і польскіх бягунцоў кідалі свае вёскі і гаспадаркі і выежджалі ў Расею, дзе іх спаткалі голад і холад.

Сустрэлі так сама і варожыя адносіны расейскіх жыхароў, якія прычынаю ўселякіх няшчасьцяў (недарод, посуш, дарагоўля, пошесьці),—углядалі ў тых няшчасных уцекачох, абзываючы іх паганымі і не пускаючы нават ў хату.

Тысячы палякаў і беларусаў служыўшых у расейскай арміі і бараніўшых Расею ад немцаў—былі пакалечаны і забіты.

У 1917 гаду ў Расеі сталася рэвалюцыя, армія расейская распалася і немцы акупавалі залітыя сьлязьмі і крывёю польскія і беларускія землі. Заняўшы ўсю Польшчу і Беларусь, немцы пачалі сыстэматычна выматываць з іх усё, што можна яшчэ было выцягнуць: збожжа, лес, лён і працоўную сілу.

А тая самая, за якую Беларусь і Польшча цярпелі ў часе вайны, — „едзіная і недзелімая Расея“ стаяла цяпер у старонцы і нічым не цярпела ад акупантаў.

У гэты час Польшча з дапамогай немцаў абвясьціла сябе незалежнай і аддзялілася зусім ад Расеі, а так сама і беларускі народ, без усялякай дапамогі абвясьціў сваю Бацькаўшчыну незалежнай Народнай Рэспублікай. Да гэтага часу доля пераможных польскага і беларускага народаў была аднолькова і прышла для іх нарэшце шчасьлівая гадзіна вызваленьня ад расейскага ярма.

Але што сталася далей — так дзіўна, што зусім не падобна да праўды.

Толькі што вырваўшыся з расейскіх ціскоў і ня-

мецкай акупацыі, толькі крышачку набраўшыся моцы, Польшча пачынае паўтараць ганебны прыклад сваіх расейскіх прыгнетачоў.

Польскі урад зложаны з буржуазна-шавіністычнай клясы стаў пхаць свае легіоны на ўсход і пад відам барацьбы з бальшавікамі заняў амаль што ня ўсю Беларусь, кажучы сабе і ўсяму сьвету, што польскія войскі займаюць не беларускія землі, а „ўсходнія“ землі Польшчы. З другога боку савецкі ўрад лічучы Беларусь, „заходняй областцю Расеі“ так сама пхае сваю чырвоную армію на беларускія землі.

У выніку ўсяго гэтага паміж Польшчай і Расеяй пачалася вайна і ўрэшце яны падзялілі Беларусь на дзьве часткі, ня гледзючы на тоя, што беларускі ўрад крычаў на ўвесь сьвет аб гэтай непраўдападобнай і жорсткай справе і заяўляў свае пратэсты савецкаму і польскаму ўрадам проці падзелу беларускага народу.

Ня дзіва было-б бачыць імкненьне захапіць частку Беларусі зноў ў свае лапы з боку маскоўшчыны: яна шмат гадоў прыгнятала беларускі народ, спыняла беларускі рух і абмаскалівала Беларусь на ўсе стараны. Гэтую палітыку расейскія патрыёты выссалі з малаком мацеры.

Але ня толькі дзіўна, а й зусім незразумела, як Польшча, тая самая Польшча столькі гадоў цярпеўшая мукі ад Маскоўшчыны, так добра выпрабаваўшая на сваей ўласнай скуры гнёт пераможцаў, столькі часу адчуваўшая як ея ворагі сядзелі і балявалі на яе жывым целе і крычалі: „Німа ніякой Польшчы! Ёсць вя-

лікая Расея"!? Тая Польшча, так дасканала пазнаўшая як цяжка быць пад чужой няволяй і ня мець нават права гутарыць і адукавацца на роднай мове, — як жа-ж тая самая Польшча магла дайсьці да таго, што пасылае свае легіоны займаць землі беларускага народу? Як жа-ж магла тая самая многапакутная Польшча сьціснуўшы яшчэ больш многапакутную Беларусь, ссаць з замучанага і часова слабейшага беларускага народу апошнія сокі і ўпадабляючыся расейскім патрыотам крычаць на ўвесь сьвет: „Нема жаднэй Бялорусі! Ёсьць толькі вялікая ад можа да можа Польшча!"??

Якім жа чынам Польшча з прыгнечанай зрабілася прыгнятаючай? Якія стасункі прымусілі Польшчу стацца прыгнетчыцай беларускага народу, які разам з ею быў столькі гадоў „пад дзяржаўным вокам" царскай Расеі, разам з ею цярпеў расейскае ярмо і разам з ею хаваў і кукобіў ідэю свайго нацыянальнага адраджэньня і цярпліва чакаў шчасьлівай гадзіны сваяго вызваленьня.

Чаму Польшча пачала душыць беларускі рух? Чаму польская ўлада ў 1919 гаду разагнала беларускі Ўрад у Менску і сяброў яго кінула ў турму? Чаму польская адміністрацыя зачыняе ў Горадзеншчыне беларускія коопэратывы, арэштоўвае коопэратыўных працаўнікоў—беларусаў і канфіскуе склады тавараў, якіх так жадае беларуская вёска? З якой прычыны зачынены ў Горадні беларускі Нацыянальны камітэт і польскія жандары арэштавалі беларускіх дзеячоў і пасадзілі ў турму? Чаму-ж арэштовываюць беларускіх

вучыцялёў і высылаюць у концэнтрацыйныя лагеры? Чаму польская ўлада так перашкаджае адчыняць беларускія школы і польскія жандары так зьбіваюць тых селян, якія выносяць пастановы аб адкрыцьці ў ініх вёсках беларускіх школ? Чаму, ўрэшце, польская ўлада зачыняе беларускія газэты і, наагул кажучы, не дае свабодна разьвівацца нацыянальным беларускім арганізацыям і ня хочэ існаваньня незалежнай Беларусі?

Перш чым даць адповедзь на тыя пытаньні, цікава зьвярнуць увагу яшчэ раз на тое, што польскі урад, толькі пачаўшы ўзмацовывацца, толькі, можна казаць, яшчэ нарадзіўся і ўжо захоплівае чужыя землі і так моцна уціскае беларускі народ. І ўжо нецікава, а жудасна памысьліць аб тым, што будзе, калі Польшча ўзмацуецца і вырасьце?

Гледзючы і разважаючы цяперашнія варункі і крокі шовіністычнай Польшчы, можна быць пэўным, можна бяз рыску ўпасьць ў абмылку, прадсказаць, што ня толькі ў самой Польшчы, але і побач з ею, кожнаму не паляку, — будзь то літвін, беларус, жыд, ці украінец, — жыцьця ўжо ня будзе... Ўглядаючыся ў будучыну, пачынае здавацца, што вяртаюцца назад даўно мінулыя дзікія часы і зноў мы ў 20-м веку ўбачым, як дужэйшы народ пачынае скручываць слабейшы народ вяроўкамі, кідае яго пад дошкі і на дошках гэтых спраўляе ганебную урачыстасьць і танцуе свой ведзьмарскі танец...

Але адкажам на вышэйпастаўленыя намі пытаньня.

На Беларусі шмат зямлі і лясоў, больш, як 60% яўляюцца асабістай ўласнасьцю польскіх паноў, якія баяцца, каб гэтыя землі і лясы не дасталіся і не былі падзелены паміж бяднейшымі беларусамі-селянамі, калі Беларусь вызваліцца ад ворагаў сваіх і пачне сваё незалежнае істнаваньне. А ў польскім урадзе, ды ў ва ўсіх галоўных установах шмат сядзіць тых самых паноў. Яны добра ведаюць, што калі на Беларусі будзе панаваць сам працоўны беларускі народ — тагды разьвітайцеся паночкі з вашымі абшарамі зямлі, вялізарнымі лясамі і пекнымі палацамі!..

Дзеля таго-ж тыя паны і кіруюць увесь польскі урад, каб не даваць умацавацца незалежнасьці Беларусі. Дзеля ратаваньня сваіх багацьцяў яны ўгаварываюць увесь польскі народ і нават увесь сьвет, што німа ніякай Беларусі і што той народ, які жыве на ўсходніх землях Польшчы — не беларусы, а абмаскаленыя палякі і мова іх ёсьць не беларуская, а сапсутая расейцамі польская мова.

Другая прычына, чаму Польшча жадае як найбольш праглынуць Беларускіх зямель маецца вось у чым.

Насяленьне ў польскіх землях і цяперака ўжо даволі густое і дзеля гэтага становіцца мала аромай зямлі, а яшчэ менш лесу для будовы. А праз 50 гадоў лік жыхароў ў Польшчы павялічыцца ў два разы. Значыцца, к таму часу ў Польшчы зусім ня будзе хапаць польскім селянам зямлі і лесу. Дык каб павялічыць свае зямельныя і лясныя абшары і гэтакім

чынам мець запас іх на будучыну. Польшча пашырае сваё панаваньне за кошт Беларусі, дзе яшчэ лічба жыхароў не так вяліка і ёсьць яшчэ шмат лясоў, а зямлі калі ня будзе панскай ўласьнасьці і асушаны будуць балоты—хопіць яшчэ на многа гадоў.

На гэтыя захопленыя беларускія землі Польшча будзе пасылаць сваіх беззямельных сялян, а гэта польскім шовіністам вельмі па сэрцу, бо такім чынам лягчэй і хутчэй магчыма будзе апалячыць Беларусь і ў будучыне зрабіць яе часткаю Польшчы. Так вось ў чым крыюцца прычыны таго, чаму польскі урад пхаў войска Жэлігоўскага на Літву і на Беларусь!

Але яшчэ ня ўсе.

Польшча памятаючы стасункі нямецка - рускай вайны, калі яна лічылася акраінай Расеі, зьведаўшы на сабе ўсю цягату фронта і чужацкай акупацыі навучаная ўжо горкім досьледам забірае Беларусь яшчэ і дзеля таго, каб мець яе сваей акраінай з боку Расеі.

І на здарэньне вайны, фронт безумоўна будзе больш адбывацца на беларускіх землях, а не ў самай Польшчы. І што самае галоўнае — калі Польшчы прыйдзецца цяжка і трэба будзе замірыцца,—яна каб выратаваць сябе з бяды, аддасьць беларускія землі, як быццам уступаючы частку сваей ўласнай тэрыторыі.

Пад канец трэба азначыць, што расейскі гнёт над польскім народам узгадаваў ў яго сэрцы, асабліва ў сэрцы польскай арыстакрацыі, якая цяпер кіруе польскай палітыкай — страшэнны шовінізм. г. з., сьляпую

ненавісьць да ўсяго расейскага і наагул да ўсяго ня польскага. Польскія палітыкі асьлепленыя тым шалёным шовінізмам стараюцца памсьціцца над усім што ляжыць на ўсход ад Польшчы і валяць ў адну кучу з маскоўцамі і беларусаў.

У злосьці палякі і беларусаў лічуць „маскалямі“ і ня маючы сілы памсьціцца запраўдным расейцам,— зьдзекуюцца над часова безбаронным беларускім народам. І гэтая часовая яго безбароннасьць толькі больш распаляе сэрца катаў, якія спраўляюць сваю перамогу, як калісь спраўляў расейскі царызм над польскім народам. І ад абодвух баляў у беларускага народа цяжкае пахмельле, не заслужаны боль і цярпеньне. Гэты боль, гэта цяжкае пахмельле, якія беларускі народ адчувае ад расейскага і польскага балю ляпей ўсяго пакажуць беларускаму народу яго шлях.

„Беларускае пахмельле“ не павінна прамінуць бязсьледна. Няхай ведае і памятуе многапакутны беларускі народ, хто вінен у яго цяперашніх цярпеньнях, няхай уразумее, што яго шлях ідзе ні да Расеі, якая балявала над ім прыдушаным разам з польскім народам, ні да Польшчы, якая толькі што выкараскаўшыся з расейскіх лап сама ўжо душыць беларусаў і стараецца атруціць нацыянальны іх дух і загубіць веру ў адраджэньне сваей Бацькаўшчыны!

Няхай яркім агнем гарыць у грудзёх беларускіх сыноў шчырая і глыбокая любоў да сваей грубападзелянай і мардаванай маці-Беларусі!

А калі прыдзе час і пачнуць пытацца да каго хоча

прылучыцца беларускі народ, калі ці Расея ці Польшча будуць працягаць да яго свае „прыхільныя“ рукі, —тагды ўвесь беларускі народ павінен з агідай адрынуць ад сябе гэтыя запэцканыя ў беларускай крыві рукі і казаць, што з імі ён ніколі не захоча злучацца, што ён будзе безустанку і безупынна змагацца за абьеднаньне разорванай на часткі сваей Бацькаўшчыны і за поўную волю і незалежнасьць яе і ня ціха даваць адказ, а голасна крычаць і крычаць так, каб учулі ня толькі Масква і Варшава, але каб учуў весь сьвет і ведаў, што **не сканаў многапакутны беларускі народ, а жыве, хоча і будзе жыць і дабьецца поўнага вызваленьня сваей роднай Беларусі.**

160 —

МШП „ЭГІДА ІІ"

&

БЕЛАРУСКАЕ КООПЭРАЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВА „АДРАДЖЭНЬНЕ". МЕНСК, 1993

*заказ 31 наклад 500 ліцэнзія №500*